УДК 94(474/476)ВКЛ:71

# КАСЦЕЛЬНАЯ ДЗЕСЯЦІНА НА ЗЕМЛЯХ ЛЯХАВІЦКАГА ГРАФСТВА (XVII–XVIII стст.)

**Булаты Павел Юр’евіч**
аспірант кафедры гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі
ўстановы адукацыі «Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы»;
магістр кіравання
(г. Мінск, Беларусь)

У Вялікім княстве Літоўскім каталіцкі касцёл з’яўляўся буйным зямельным уласнікам і адыгрываў значную ролю ў эканамічным жыцці дзяржавы. Апроч непасрэдна Віленскага біскупства і ордэнаў, уласнасць належала шматлікім парафіям. Асобна варта адзначыць каталіцкія парафіі, якія знаходзіліся на землях буйных магнацкіх маёнткаў, у тым ліку тытулаваных (графствах). Уласціваю рысаю магнатэрыі ВКЛ была фундатарская дзейнасць на карысць царквы, у тым ліку каталіцкай, і шчодрае матэрыяльнае забеспячэнне парафій. У сувязі з гэтым, парафіі буйных маёнткаў за кошт ахвяраванняў з’яўляліся досыць забяспечанымі матэрыяльна, што давала ім рэсурс для вядзення актыўнай гаспадарчай дзейнасці. Адной з форм забеспячэння касцёла з’яўлялася дзесяціна, якая спаганялася з падуладнага магнату маёнтка.

Пад дзесяцінай як формай падатку разумеецца прынашэнне царкве дзясятай часткі даходаў, якая прызначалася на ўтрыманне парафіі і пробашча. У Вялікім княстве Літоўскім XV–XVI стст. дзесяціна была снопавая (сяляне адкладвалі кожны 10-ы сноп) і агульная (1/10 частка збожжа, мёду і інш.).



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Традыцыя выплаты дзесяціны на ўтрыманне царквы мае біблейскія старазаветныя вытокі. Дзесяціна была вядомая яўрэям яшчэ задоўга да часоў Маісея і сягае да Абрама, які даў першасвятару Мельхісэдэху дзясятую частку ўсёй здабычы, атрыманай ім ад чатырох пераможаных цароў (Род. 14:17-20) [1]. Дзесяціна складалася з дзясятай часткі пладоў зямлі, статкаў і т. п. і накіроўвалася на карысць лявітаў, якія не мелі ўласнай зямлі, і служыла для іх сродкам існавання. Дзясятую частку ад дзесяціны лявіты ў сваю чаргу адлічвалі на ўтрыманне першасвятара (Ліч. 18:21-32) [1]. Дзесяціну натурай дазвалялася замяняць і грашыма (Паўт. зак. 14:24-26) [1].

Дадзеная традыцыя замацавалася ў хрысціянскай царкве. На захадзе Еўропы дзесяціна першапачаткова была простым добраахвотным прынашэннем ў царкву з дзясятай часткі даходаў; але памаленьку царква зрабіла дзесяціну абавязковай: Турскі сабор 567 г. запрашаў верных уносіць дзесяціну, Маконскі сабор 585 г. ужо прадпісваў плаціць дзесяціну пад пагрозай адлучэння. З распаўсюджаннем хрысціянства на землях усходніх славян замацавалася на стагоддзі і традыцыя выплаты царкоўнага падатку ў выглядзе дзесяціны.

На прыкладзе дзесяціны, якая існавала на землях магнацкага маёнтка Ляхавіцкае графства, падрабязны расклад якой відавочна адлюстраваны ў шэрагу крыніц, разгледзім дадзены від падатку.

Дзесяціна на карысць Ляхавіцкага касцёла Святога Крыжа ўсталёўвалася фундушовым запісам [2], які закладаў у горадзе новую парафію. Адпаведны дакумент 12 траўня 1602 г. выдалі ўладар Ляхавіцкага графства Ян Караль Хадкевіч і яго жонка Соф'я Мілецкая. Згодна з ім, ад сям'і Хадкевічаў касцёл атрымаў шчырае матэрыяльнае забеспячэнне з маёнтка. Ва ўладанне ляхавіцкаму плябану (у той час ім быў Адам Мілеўскі) з Ляхавіцкага графства перадаваліся: 50 валок зямлі, дзве вёскі, тры фальваркі, гарадская юрыдыка. Таксама вызначаўся шэраг выплат на карысць парафіі. Апроч таго, фундушам вызначалася дзесяціна з вёсак Ляхавіцкага графства памерам у 50 коп жыта. У выпадку адсутнасці жыта прадугледжвалася грашовая альтэрнатыва – 50 злотых [2].

Дакументы, якія датычацца падрабязнага раскладу дзесяціны датуюцца пачаткам XVIII ст. Так, пад час Паўночнай вайны і аблогі Ляхавіцкай фартэцыі 1706 і 1709 гг. быў знішчаны Ляхавіцкі касцёл. Адраджалася касцельнае жыццё ў горадзе пробашчам, віленскім канонікам Казімірам Анцутам: узводзіўся новы будынак касцёла, аднаўляліся маёмасныя правы, акрэсленыя фундушамі, у тым ліку і выплата дзесяціны.

Дзесяціна акрэсліваецца лістом уладара Ляхавіцкага графства Ежы Феліцыяна Сапегі ў 1718 г. (дакумент захоўваецца ў бібліятэцы Акадэміі навук Літвы) [3], а затым у 1721 г. зацвярджаецца на паседжанні Галоўнага Трыбунала (акт захоўваюцца ў аддзеле рукапісаў бібліятэкі Віленскага



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

ўніверсітэта) [4]. У дакументах пералічваюцца двары Ляхавіцкага графства, іх арандатары (пры наяўнасці), сумы грошаў і копы жыта, якія мусяць паступаць на карысць касцёла ў тэрмін да дня Святога Міхала (29 верасня). Падрабязны расклад дзесяціны для Ляхавіцкага графства прадстаўлены ў табліцы 1, датуецца 1721 г. Вызначана яна ўраднікамі на кадэнцыі да Графства Ляхавіцкага дэкрэтам Галоўнага Трыбунала ВКЛ у 1720 годзе.

**Расклад дзесяціны жытам ад 27 студзеня 1721 г.**
**ад Ляхавіцкага графства касцёлу Ляхавіцкаму**

| Вёска | Арандатар | Копы жыта | Снопы жыта | Грошы (копы) |
|---|---|---|---|---|
| Вялікая Лотва | Уладзіслаў Ванькові ч | 10 | - | 50 |
| Малая Лотва | | 3 | - | 20 |
| Голдавічы | Геранім Выжгерд | 3 | - | 15 |
| Літва | Казімір Хеждзінскі | - | 30 | 8 |
| Зарытава і Жарабковічы | Пятра Клята | 10 | - | 55 |
| Зубелевічы з Зямянамі | Міхал Міштольд | 4 | - | 23 |
| Мыслабаж | Двары Ляхавіцкага графства | 1 | 40 | 10 |
| Ганцэвічы | | - | 20 | 6 |
| Вадзяцін | | - | 15 | 3 |
| Старыя Ляхавічы і Падлессе | | 10 | 40 | 55 |
| Шавялі | | 5 | 20 | 20 |
| Гулічы | | 1 | - | 3 |
| Skure | | - | 15 | 2 |
| **Агулам** | | **50** | **-** | **270** |

Усталяваныя лічбы выплат – 50 коп жыта (альтэрнатыва 50 злотых) і 270 коп грошаў – стабільна паступалі парафіі з Ляхавіцкага графства ў 1745 г. [5] і 1782 г. [6], аб чым сведчаць звесткі з актаў касцельных візітацый. Паўторнае зацвярджэнне дзесяціны адбылося ў 1793 г. і расклад сум застаўся нязменным [7].

Такім чынам, разгледзеўшы расклад касцельнай дзесяціны, якая з'яўлялася традыцыйнай і старажытнай формай падаткаабкладання, можна адзначыць наступнае:

1) для Ляхавіцкай парафіі паступленні ў выглядзе дзесяціны з'яўляліся значнай часткаю ў даходах касцёла;

2) дзесяціна мела разнастайны характар: як натуральная (збожжам), так і грашовая;

3) падатак датычыўся ўсіх вёсак і двароў, якія ўваходзілі ў склад Ляхавіцкага графства, у тым ліку і тыя, якія знаходзіліся ў часовай арэндзе ў іншых асоб;

4) размер дзесяціны заставаўся нязменным доўгі час.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## Літаратура


1. Біблія. Кнігі Святога Пісання Старога і Новага Запаветаў. – Мінск : Біблейская таварыства ў Рэспубліцы Беларусь, 2012. – 1120 с.
2. Lietuvos mokslų akademijos biblioteka (LMAB). – F20. Nr. 221.
3. LMAB. – F. 20. Nr. 1793.
4. Vilniaus universiteto biblioteka (VUB). – F. 5. V. F123. NR. 31380/1.
5. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 1781. Воп. 27. Спр. 213.
6. НГАБ. – Ф. 1781. Воп. 27. Спр. 223.
7. НГАБ. – Ф. 1738. Воп. 1. Спр. 1. Л. 195–200.


ный архив библиотеки МГУ имени А.А. Ку